Прыйдзі сюды і тут адпачывай,
Калі душа ў самоце.

Люблю падняцца ранaчкам з зарой,
Ісці ў палі, дзе ніва каласіцца.
І дзе вярба схілілась над ракой,
Ў люстэрка вод глядзіць не наглядзіцца.

АСЕННІ НАСТРОЙ

А восень зноў ідзе-брыдзе,
То жоўтым лісцем намалюе,
Кругі напіша на вадзе,
То каля рэчкі засумуе.

То пазалоціць лесу край,
Напоўніць горыччу каліну,
То паляціць за небакрай
Паслухаць гоман жураўліны.

І паспявае ўсім адна
Пашыць асеннія абновы,
Яшчэ да мокрага акна
Прыклеіць жоўты ліст кляновы.



ВОСЕНЬ

Восень барвовая і залатая,
Светла-карычневая і крамяная,
Восень багатая і пладавітая,
І павуцінкаю моцна спавітая,
Яркімі фарбамі размаляваная,
Лёнам карычневым у лузе пасланая,
Дожджыкам шчодрым асеннім памытая,
Белым малочным туманам накрытая.
Восень мінорная, восень самотная,
Восень такая шчымліва-пяшчотная.
Восень з вадою крынічнай гаючая,
З печанай бульбай такая пахучая.

ПАЭЗІЯ

САМОТНЫЯ ЧАТЫРОХРАДКОЎІ

***
Дэкляравалі нам вялікія паны
Зямельку, волю, шчасце, пірагі.
Мы атрымалі ўрэшце кайданы,
Каб ведалі, што вецер волі надта дарагі.
***
Жанчынаў мы ў нябёсы ўзнялі.
І роўныя з мужчынамі далі правы.
Цяпер яны, як коні ў манежы,
За нас і за сябе працуюць без мяжы.
***
Трохкутнік кахання, як музыка лёсу,
Адвечная песня зямнога жыцця.
Нічога не зменіш, хоць скаргі да Бога
Пішы з той нагоды штодня.
***
О! Як умее абяцаць
Дарослы люд, што пры пасадзе.
Яму што плюнуць ашукаць,
А мы заўжды ў накладзе.
***
І паводле грозных дырэктыў
Свіней калолі спрытна.
Ды хутка спішам у актыў,
Што прагулялі гэту бітву.
***
Я помню былыя гады,
Час нас раскідаў па свеце.
І толькі забачу вас, любы сябры,
Пачую: "Абмыем сустрэчу!"
***
Уласны розум кожнага ўзнясе.
Такія рэчаіснасці законы.
Адзін — пакліча ў светлу далячыць,
Другі — падніме цэны.
***
Было вялікіх мноства на зямлі.
Дый кожны чалавечак прагне славы.
Дол ураўняў усіх правы,
І сумнявацца ў тым няма падставы.
***
А праўду-матухну я рэжу, не хлушу,
Ні хвіліны не бяру на роздум,
Калі суседу плюну ў душу,
Тады ўспомню пра свой розум.
***
Краінай доўга правіў гаспадар,
І думкі мудрыя да нас штодня ляцелі,
І кожная, што новы тастамент,
А мы ўсё болей дзіцянелі.
***
Халуй хацеў падобным быць да спадара
І нават апранаў такія ж уборы,
І гаварыў так важна, спакваля,
Ды ў паясніцы быў сагнёны.
***
Я будаваў шчаслівае жыццё,
Заліўшы самагонкай сваё горла,
А ў іх было шчаслівае быццё,
Хапала ім ўсяго па горла.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЮНОШЕСКОЕ ПЕРВЕНСТВО БЕЛАРУСИ ПО ФУТБОЛУ

ДВЕ ЗАСЛУЖЕННЫЕ ПОБЕДЫ



Напряжённая борьба за мяч

«СЛОНИМ»-96 — «ГРАНИТ»-96 (МИКАШЕВИЧИ) — 4:2 (3:1)

14 сентября. г. Слоним. Стадион «Белтрансгаз». 50 зрителей.
Судья — Е. Коваль (Волковыск).
Голы: 1:0 – Подрецкий, 12; 2:0 – Берг, 20; 2:1 – Щиголев, 27; 3:1 – Борисевич, 29; 4:1 – Подрецкий, 46 с пен.; 4:2 – Юрковский, 66.
«Слоним»–96 (4–1–4–1): Рупшис С. – Жилинский, Романюк, Лойко, Турук – Берг Влад (к) – Мандрык (Снопко), Борисевич, Литвинчик (Чигир), Тычинский (Хвесеня) – Подрецкий.

Игра прошла под диктовку хозяев поля. И лишь несколько просчётов вратаря и обороны скрасили гостям крупное поражение. Уже в первых двух атаках слонимчане имели явные моменты для взятия ворот, но нерасторопность при завершении превратила голевые атаки в рядовые.

Наконец-то свои первые мячи стал забивать Сергей Подрецкий. Его рейд к воротам и выход тет-а-тет с голкипером закончился взятием ворот.

Яркий футбол и командная игра стали залогом успеха. Очередные атаки и счёт пошли в пользу слонимчан. Выверенная передача на набегавшего капитана Владислава Берга, и он в одно касание переправил мяч в сетку — 2:0.

В эпизоде, когда гости пробивали штрафной удар, мяч от головы их нападающего после касания перекладины ворот влетел в сетку.

В следующей атаке потрясающий мяч забил Артур Борисевич. Окруженный несколькими соперниками, Артур увидел, что вратарь «Гранита» вышел из ворот, и смог воспользоваться этим.

После перерыва за игру рукой в пределах штрафной судья назначил в ворота микашевичских футболистов пенальти, который реализовал Подрецкий.

Не преминули забить свой мяч и соперники. Они воспользовались тем, что наш вратарь стал выстраивать стенку после нарушения, а перед мячом никого не было — дальний разящий удар и счёт стал 4:2. И, как оказалось по прошествии игрового времени, он не изменился.

Без напряжения прошла и следующая игра ребят на два года младше. Уже на второй минуте Никита Свита вышел один на один с вратарём и открыл счёт.

«СЛОНИМ»-98 — «ГРАНИТ»-98 (МИКАШЕВИЧИ) — 4:1 (1:0)

14 сентября. г. Слоним. Стадион «Белтрансгаз». 50 зрителей.
Судья — Е. Коваль (Волковыск).
Голы: 1:0 – Свита, 2; 2:0 – Алексонис, 50; 3:0 – Варивончик, 54; 4:0 – Алексонис, 62; 4:1 – Саакян, 78.
«Слоним» — 98 (4–4–2): Тябус – Ляшевич (к), Рупшис А., Зезюлин (Сергей), Чурсин – Мочалов, Ничипорович (Петлицкий), Алексонис, Эдер – Свита (Шупеня, Курчевский), Варивончик.

Все старания развить успех до перерыва ничем не увенчались, но моментов было предостаточно. Все голевые атаки слонимчане оставили на второй тайм.

Отличались два игрока по имени Владислав — Алексонис и Варивончик. И оба футболиста продемонстрировали хорошее видение поля и индивидуальное мастерство.

Под занавес матча гости при несогласованности вратаря и защитника сумели провести гол престижа.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора

ЧЕМПИОНАТ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ ПО ФУТБОЛУ

УСТАНОВИЛИ РЕКОРД

«СЛОНИМ-СИТИ» — «НАДЕЖДА» (ИВЬЕ) — 12:2 (6:2)

15 сентября. г. Слоним. Стадион «Белтрансгаз». 50 зрителей.
Судья — А. Надиевский (Гродно).
Голы: Олег Тарасюк – 4, Денис Куцко – 3, Олег Герасимчик, Виктор Берг – по 2, Сергей Кутищев.
«Слоним–Сити» (4–4–2): Берг Сергей – Артюх (Жилинский, 59), Шикуть, Левошик, Кутищев – Молчанов (к), (Берг Влад, 61), Тарасюк (Лунь, 57), Куцко, Дегиль (Подрецкий, 60) – Герасимчик, Берг Виктор.
Тренер – Руслан Корнев.

Соперники оказались совсем в разных весовых категориях — гости замыкают турнирную таблицу чемпионата, а слонимчане находятся в лидирующей группе.

Мячи, которые забивали хозяева, были схожие по сценарию. Горожане начинали со своей половины поля, а потом делали выверенные передачи в свободную зону, где на скорости хозяева просто пронзали оборонительные редуты соперников.

Ударно работал правый край полузащиты, где Олег Тарасюк не только сам забивал, но и ассистировал партнёрам. Денис Куцко свои мячи забивал с пределов штрафной площади, когда уверенно делал подбор или находился в нужное время и в нужном месте.

Два дубля на счету игроков линии атаки. Олег Герасимчик открыл счёт в матче благодаря индивидуальному проходу, а через пять минут реализовал пенальти.

Виктор Берг, который заработал пенальти, смог ещё забить после старания партнёров дважды. Более активными команды выглядели в начале обоих таймов, потом игра шла просто на удержание, или футболисты плохо реализовали голевые моменты.

Рекорд чемпионата по количеству забитых мячей в этом году установлен — 12:2.

Егор ЖИГАЛИК

ПЕРВЕНСТВО ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ ПО ФУТБОЛУ 2000 Г. Р.

ПРОДОЛЖИЛИ ПОБЕДОЙ

После продолжительного летнего перерыва возобновились игры юношеского первенства области.

Юные футболисты ДЮСШ №1 одержали пятую викторию из шести проведённых игр и возглавляют турнирную таблицу первенства. Подопечные Руслана Корнева и Андрея Молчанова переиграли волковысских ровесников со счётом 4:0.

Хет-трик на счету капитана команды Алексея Минца (СШ №5). Нападающий два мяча забил после дриблинга, ещё один — на добивании. Четвёртый мяч на счету Егора Михнюка, который хладнокровно реализовал штрафной удар.

Ближайший матч в рамках первенства состоится 22 сентября, в соперники слонимчан пожалует гродненский «Белкард».

Егор ЖИГАЛИК

ЧЕМПИОНАТ БЕЛАРУСИ ПО ФУТБОЛУ. 1-Я ЛИГА. 20-Й ТУР

ДОЛГОЖДАННАЯ ВИКТОРИЯ

«МИНСК-2» — ФК «СЛОНИМ»-

15 сентября. г. Минск. Стадион КФП ФК «Минск». 150 зрителей.
Судья —
Голы: 0:1 – Юзвович, с пен.; 1:1 – Сапон, 55; 1:2 – Жегало, 59.
«Слоним»: Курганский, Голубев, Жуков, Анцыпов (к), Жданок (Кудаш, 46), Шикавка (Климихин, 66), Орочко (Соколовский, 72), Якубович, Кухарёнок (Каленик, 88), Жегало, Юзвович (Дубай, 52).
Главный тренер – Алексей Шубенок.

Последний раз слонимчане праздновали победу в шестом туре чемпионата 24 мая. И вот двадцатый тур оказался удачным для подопечных Алексея Шубенка, который в этот день отмечал день рождения.

Как оказалось, футболисты не подкачали и преподнесли своему наставнику подарок. С первых минут встречи гости захватили не только игровую инициативу, но и территориально вытеснили соперника на его половину.

До чего-то обостряющего дело не доходило, было несколько опасных угловых. На 31-й минуте Дениса Якубовича соперник сбил в штрафной — пенальти чётко реализовал Дмитрий Юзвович.

Через десять минут слонимчане могли удвоить счёт, но тот же Юзвович не смог с «точки» переиграть голкипера минчан.

После отражённого пенальти соперники почувствовали, что они тоже могут опасно атаковать. Глотком свежего воздуха для юных минчан послужил этот момент.

После перерыва, как и в концовке первого тайма, хозяева стали чаще угрожать воротам гостей. Вскоре они своего добились — быстро проведённая контратака лишила гостей концентрации, прострел с фланга и удар в противоход вратарю — 1:1.

На этом достижении столичные футболисты и успокоились. Слонимчанам нужна была только победа, они её и добились. Воспрянувшие духом гости провели несколько хороших атак. Максим Дубай стал ассистентом Александру Жегало, который просто закатил мяч в ворота.

По прошествии времени эта связка ещё несколько раз досаждала оборонительным редутам хозяев, но счёт не изменился.

Егор ЖИГАЛИК

Турнирная таблица после 20-го тура

С		И	В	Н	П	Мячи	О
1	Городея	20	14	3	3	50-22	45
2	Слуцк	20	13	5	2	38-13	44
3	Лида	20	10	6	4	32-22	36
4	Витебск	19	10	5	4	26-21	35
5	Берёза-2010	20	10	4	6	24-22	34
6	Волна Пинск	20	9	5	6	25-23	32
7	Сморгонь	20	9	4	7	33-23	31
8	Гранит Микашевичи	20	7	6	7	22-17	27
9	Смолевичи-СТИ	20	7	6	7	27-25	27
10	Ислочь	20	6	8	6	22-24	26
11	Ведрич-97 Речица	19	6	6	7	27-23	24
12	Химик Светлогорск	19	6	4	9	16-27	22
13	**Слоним**	**20**	**3**	**9**	**8**	**26-40**	**18**
14	Минск-2	20	3	4	13	16-36	13
15	Полоцк	17	2	4	11	7-24	10
16	СКВИЧ Минск	20	1	3	16	10-39	6

НАВІНЫ МАСТОЎШЧЫНЫ

СВІНЫ ПОСТ ЗМЯНІЎ ДЫСЛАКАЦЫЮ



Доўгі час кругласутачны міліцэйскі пост, які правяраў аўтамабілі на прадмет вывазу свініны з раёна ў сувязі з афрыканскай чумой, знаходзіўся ў вёсцы Мікелеўшчына, што на мяжы Шчучынскага раёна.

Зараз ён перамешчаны ў вёску Масты Правыя і знаходзіцца на скрыжаванні аўтадарог як на Шчучын, так і на Слонім.

Кіроўцы лічаць гэты пост агулам непатрэбным, бо яго можна аб'ехаць па суседняй вуліцы. Гэтак жа да яго ставяцца мясцовыя жыхары, якія мяркуюць, што кантраляваць пасля знішчэння свіней няма чаго. Нават той чалавек, які схаваў парсюка, заколе яго на Каляды для ўласнай патрэбы.

Аднак усё роўна дзень і ноч супрацоўнікі міліцыі спыняюць машыны і корпаюцца ў багажніках.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ВОЗ ДА АГЛЯДУ

ДАІ прызначыла 20 месцаў на тэрыторыі Мастоўскага раёна для правядзення тэхагляду гужавога транспарту на прадмет абсталявання іх святлопавяртальнікамі. У асноўным гэта калгасныя майстэрні.



Калі з вазамі прадпрыемстваў рознага накірунку праблем не існуе, то з прыватнікамі справа іншая. І яна не ў тым, што ў прызначаны дзень давядзецца гнаць каня з возам за дзесяць і болей кіламетраў. Супрацоўнікі ДАІ падышлі да гэтае справы фармальна. Паведамленне аб правядзенні акцыі пабачыла свет за дзень да яе пачатку ў мясцовым друку.

На агляд падобных сродкаў руху у адным пункце адводзіцца меней за гадзіну. Прыкладам, у першы дзень было праведзена пяць праверак. Яны прайшлі з 10 ранку да 14 дня. Пры гэтым супрацоўнікі ДАІ наездзілі самі між пяццю населенымі пунктамі амаль сто кіламетраў.

Мала хто з прыватнікаў прадстаўляе для агляду свае вазы. Па-першае, яны не ведаюць пра падобнае мерапрыемства. Па-другое, заняты з ранку да вечара асеннімі сельгасработамі.

Пастаўленая на мэце праверка ведання фурманамі правілаў дарожнага руху пры такім падыходзе мастоўскімі ДАІстамі да правядзення акцыі нерэальна. Аднак пасля яе заканчэння — 25 верасня — ёсць усе падставы для накладання штрафу.

Месца правядзення тэхагляду вазоў прыватнага сектара горада агулам не прызначалася, хоць тут утрымліваецца не адзін дзясятак коней.

Язэп ПАЛУБЯТКА

З НАТУРЫ

НУ І КАМУ ЗРАБІЛА ГОРШ?

Лідскі аўтавакзал. На пасадачнай пляцоўцы сабралася шмат людзей: вось-вось павінны падаць аўтобус Ліда — Слонім.

Амаль палову лаўкі займаюць два вялікія цэлафанавыя пакеты. Іх гаспадыня — пажылая кабета — стаіць побач.

—А лаўкі не для багажу, а для таго, каб людзі на іх маглі сесці, — робіць заўвагу той кабеце нейкая маладзіца з дзіцём.

—Сядай ужо! — гнеўна буркнула пажылая і, схапіўшы пакеты, бразнула іх аб асфальт. У адным з іх нешта дзынкнула, відаць, пабіўся шкляны посуд. Добра, калі парожні.

—Зазвярэеце, мабыць, калі не пасядзіце! — мовіла яна ўжо да ўсіх, хто стаяў на пляцоўцы. Ніхто не абазваўся.

Ну, і навошта было злавацца, можна сказаць, на пустым месцы? Сапсавала настрой сабе, маладзіцу пакрыўдзіла… Прыкра.

СІТУАЦЫЯ, АДНАК...

Дзятлаўскі рынак. Да машыны з жывой рыбай выстраілася чарга. Да яе падышла кабета з роварам і хацела пацікавіцца, якая рыба і колькі каштуе. Не паспелі ёй адказаць, як жанчына з чаргі, разлічыўшыся за тавар, пачала адыходзіць, але, ступіўшы назад, наткнулася на ровар і пачала падаць. Гаспадыня ровара разам са сваім транспартным сродкам таксама пачала падаць і навалілася яшчэ на адну, што таксама падышла пацікавіцца. Яна трымала ў руках доўгі карніз і ледзь не стукнула ім па твары маладзіцу, якая праходзіла міма.

Павінен быў спрацаваць прынцып даміно, але чамусьці не спрацаваў, і ўсе ўтрымаліся на нагах, хоць і зніякавелі ад нечаканасці.

—Ну, зараз пачнецца дыспут на тэму “Хто вінаваты?”, — кажа мая знаёмая.

Але яна не ўгадала. Замест таго, каб высвятляць адносіны, жанчыны з “даміно” раптам дружна засмяяліся. Ды так весела, што ўсім, хто гэта бачыў, таксама стала смешна.

А я падумала, як добра было б, каб так вырашаліся ўсе сітуацыі, каб мы былі больш добразычлівымі і лагоднымі ў адносінах адзін да другога.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Цены на съёмное жильё в Гродно приблизились к столичным

С началом учебного года взлетели цены на съемное жилье.

Сколько придется платить за аренду и почему так сильно подорожали квадратные метры, узнавала корреспондентка «Вечёрки».



ЗА ОДНОКОМНАТНУЮ КВАРТИРУ ХОТЯТ 300$

Аренда однокомнатной квартиры сейчас стоит в пределах 150–300 долларов в зависимости от меблировки квартиры и от улицы, где находится дом. Но даже в одном микрорайоне цены сильно разнятся. Допустим, за квартиру на Домбровского без мебели, но с кухней и командором просят 180 плюс коммунальные услуги, а рядышком на БЛК — всего 90 долларов. В спальных районах — на Клецкова или Лиможа — аренда стоит около 150–160 долларов в месяц. Дороже всего обойдется жилье в центре города (на Захарова, Ожешко) или в новостройке — тут цены взлетают до 220–300 долларов. К примеру, однокомнатная квартира в доме на улице Кремко выйдет в 300 долларов, но, несмотря на высокую цену, ее уже сдали.

Примерно столько же стоит аренда двухкомнатных квартир. «Двушка» в домах старой планировки на Кабяка, Поповича, Домбровского обойдется в 150–220 «зеленых», ближе к центру, на Захарова или Пролетарской, — 300–330, в спальных районах на БЛК или Клецкова — 445–500 долларов.

А вот чтобы снять трехкомнатные апартаменты, нужно иметь в кошельке не меньше 400–500 долларов. Примерно столько стоит аренда квартир на Пушкина, Дзержинского, Брикеля, Советских Пограничников.

Как правило, квартиры сдают уже с хорошим ремонтом, в них есть мебель, бытовая техника, в том числе холодильник, телевизор. Помимо аренды, придется оплачивать коммунальные услуги. Нужно учесть, что сейчас большинство арендодателей требуют стопроцентной предоплаты минимум за три месяца. А с недавнего времени появилась новая статья расходов — налоги за аренду ложатся на плечи квартирантов.

ЛЬГОТНЫЕ КВАРТИРЫ УШЛИ В ПОДПОЛЬЕ

Основная причина повышения цен на съемное жилье, считают в агентствах недвижимости, — то, что желающих снять жилье гораздо больше, чем сдающих. На ситуацию повлиял запрет с 1 июня нынешнего года сдавать в аренду «льготные» квартиры до полного погашения кредита плюс пять лет после этого. За игнорирование запрета можно получить штраф — от 400 тысяч до 3 миллионов рублей. Если человек попадется на сдаче жилья повторно, сумма возрастает до 3–5 миллионов.

Несложно подсчитать, сколько могли зарабатывать очередники на «льготных» квартирах. К примеру, сумма кредита в месяц за трехкомнатную квартиру в доме, построенном в 2011 году, составляет около 700 тысяч рублей, или примерно 80 долларов. Если сдавать ее за 300 долларов в месяц, чистый доход получится 220 долларов.

— Сейчас действительно почти нет объявлений о сдаче квартиры, например, в Ольшанке или Вишневце, потому что люди опасаются, что могут потерять квартиры. Но, думаю, они продолжают сдавать их, только подпольно, без документов и уплаты налогов, — говорит офис-менеджер отделения КЧУП «Квадратный метр» по Гродненской области Алёна Скакун.

РЫНОК СЪЕМНОГО ЖИЛЬЯ ПРЕВРАТИЛСЯ В АУКЦИОН

В повышении цен на съемное жилье отчасти виноваты и квартиранты, которые устраивают аукционы на рекламных сайтах в интернете.

— Они сами создают ажиотаж: чтобы заполучить квартиру, готовы платить больше указанной в объявлении стоимости. А если претендентов несколько, снимает квартиру тот, кто заплатит дороже, — рассказывает специалист.

Вот и выходит, что одно- и двухкомнатные квартиры дорожают до 200–250 долларов, в то время как можно найти «трешку» с хорошим ремонтом, мебелью, бытовой техникой и даже джакузи за 450 долларов.

К слову, специалисты прогнозируют, что цены на съемные квартиры падать не будут, так как подорожание не связано с наплывом иногородних студентов.

Наталья КОРНЕЕВА, "Вечерний Гродно"

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

Чорны кашалёк

На аўтастанцыі ў гэты кірмашовы дзень было шматлюдна. Большая частка пасажыраў ехала да недалёкіх вёсак, а пажылая Зоя Кружэлька ажно да самага Гродна: з вялікімі сумкамі прадуктаў накіроўвалася да сына. Сама б і не данесла такога цяжару, але муж Вінцук адпрасіўся на гадзіну з работы і падвёз на ровары.

—Глядзі ты! — здзівіўся ён. — Народу столькі, што ў аўтобус будзе не ўбіцца.

—Нічога, не перажывай, хтохто, а я ўваб'юся. Вунь, бачыш, ён стаіць на пляцоўцы, што воддаль ад пасадачных. І дзверы якраз адчынены, улезу раней за іншых. Ага! Там ужо нехта сядзіць, то і я сяду! — Зоя рашуча накіравалася да аўтобуса.

—Можа, нельга? Сварыцца будуць? — засумняваўся Вінцук.

—Пасварацца ды перастануць. А я пакуль што сумкі парассоўваю, бо як надыдзе людзей, то будзе не павярнуцца.

Вінцук дапамог унесці сумкі ў салон, кінуў вокам на маладую прывабную пасажырку, што сядзела на першым месцы і чытала нейкі часопіс.

—Вядро з яйкамі трэба паставіць на сядзенне, што ты яго ў праходзе кінуў?! Тут жа разаб'юць.

—Сама стаў куды хочаш, а я паехаў.

—Як прыйдзеш на абед, то не забудзься даць качанятам вады, а то ўжо недзе ўсю выплюхалі!

Зоя хацела яшчэ нешта казаць, але Вінцук ужо сеў на ровар і паехаў. Успомніўшы праваду, яна падумала, што з сабой не ўзяла нічога папіць. У дарозе, можа, піць захочацца, то не купляць жа ў якім буфеце на прыпынку, толькі грошы марнаваць, а яна трэслася над кожнай капейкай.

У што набраць — не знайшлося, і Зоя вырашыла папіць хоць нехаця, у запас. Яна падазрона зірнула на суседку-пасажырку: каб чаго не ўкрала — і выйшла з салона.

Калі вярталася з вадапою, то ўбачыла, што да аўтобуса ўжо ідзе вадзіцель. Не паспела ступіць на першую прыступку, як пачула яго гнеўны голас:

—А гэта яшчэ што?! Чаму на сядзенні стаіць вядро? Яно ваша?!

—А чыё ж яшчэ, канешне, маё. Да сына вось у Гродна еду, яйкі вязу і яшчэ шмат што.

—Мне ўсё роўна, куды вы едзеце і што везяце. Чаму паставілі вядро на сядзенне? Каб чахлы парваць? І наогул, чаго вы залезлі ў аўтобус раней часу? Я зараз пад'еду на пасадачную пляцоўку.

—А яна чаго тут сядзіць? — гнеўна зірнула Зоя на пасажырку.

—Яна наш кантралёр і едзе ў Гродна па службовых справах. Ды што я тут перад вамі апраўдваюся. Забірайце свае хатулі — і марш з аўтобуса на пасадачную пляцоўку.

—Не пайду, хоць міліцыю выклікай!

—У вас, можа, яшчэ і білета няма.

—Няма, як жа! Усё ў мяне ёсць, — Зоя палезла ў сумку, дзе павінен быў ляжаць чорны кашалёк з грашамі і білетам: пашукала-памацала — кашалька не было. Твар яе стаў чырвоны, як савецкі сцяг, потым белы, як снег Антарктыды. Набраўшы поўныя грудзі паветра, выпаліла на адным дыханні:



—Гэта яна ўкрала! Я хадзіла вады напіцца, а яна тым часам і ўкрала.

Жанчына з першага сядзення горка ўсміхнулася і зноў уткнулася ў часопіс.

—Бачыш, нават не апраўдваецца! Значыць, яна. Аўтобус у рэйс не пойдзе, выклікайце міліцыю! — галасіла на ўсю ваколіцу Зоя.

Усе, хто быў на аўтастанцыі, падышлі да аўтобуса: цікава ж!

Вадзіцель, чалавек пажылы, стомлены і суровы, па мабільніку выклікаў міліцыю. Два лейтэнанты не прымусілі сябе доўга чакаць.

—Міліцыянерчыкі, роднენькія, абшукайце гэту зладзейку, яна мой кашалёк украла. Чорненькі такі, з бліскучай зашчэпкай. Там жа білет мой да саменькага Гродна і жменя грошай.

—Прабачце, але такія абставіны, што мы і сапраўды павінны вас патурбаваць, — унікшы ў сутнасць справы, звярнуліся яны да пасажыркі на першым сядзенні.

Яна і слова не прамовіла, пакорліва выйшла з аўтобуса і накіравалася да міліцэйскай машыны.

—Крышку пачакайце, мы хутка, — запэўнілі міліцыянеры. — Калі будуць нараканні, што спазніліся ў рэйс, дадзім адпаведную паперу.

Не паспелі ў міліцэйскай машыне зачыніцца дзверы, як да аўтобуса на нейкай машыне прыпёрся Вінцук:

—Як добра, што паспеў, а то думаў, што аўтобус ужо пайшоў, а ты, Зоечка, сядзіш на аўтастанцыі і плачаш. Я ж як узяў табе білет, па прывычцы засунуў кашалёк сабе ва ўнутраную кішэню пінжака. Толькі на рабоце, калі распрануўся, зразумеў, што нарабіў. На табе, не злуйся…

—Старыя вароны! — абурыўся вадзіцель аўтобуса. — Забыўся! А тут з-за вас нявінны чалавек пацярпеў. Вось ваша жоначка нашага кантралёра злодзеем абазвала, яе ўжо меліся везці ў міліцыю.

—Прабачце, — вінавата прамовіў Вінцук. — Я ж не хацеў.

—Што ты мямліш? Не вялікая пані, пацерпіць! Гэта ж жарты, кашалёк быў прапаў з грашамі і білетам! Тут што хочаш скажаш.

—Вы можаце на гэтую даму ў суд падаваць. За абразу, — параіў адзін з міліцыянераў. — Сведак тут больш, чым трэба, — ён акінуў поглядам натоўп ля аўтобуса. — І мы са свайго боку засведчым.

—Нічога, неяк перажыву, — усміхнулася маладзіца. — Тут жа сказалі, што я не пані.

Праз некалькі хвілін аўтобус крануўся. Зоя як уставілася позіркам у бакавое акно, так за ўсю дарогу і не павярнула галавы. Відаць, сумленне скрывіла шыю і яна саромелася глянуць на пасажырку, што сядзела на першым сядзенні.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ПРА ТОЕ, ЯК НЁМАН АТРЫМАЎ СВАЁ ІМЯ

Гародня стаіць на рацэ Нёман. Гэта ведаюць усе гарадзенцы. А ці ведаеце вы, чаму наша рака так называецца? І што азначае слова Нёман?

Ну то слухайце. Некалі даўно, вельмі даўно біла на нашай зямлі крыніца жыцця. Шмат у тыя часы было вады на нашай зямлі.

З-за гэтага амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі было вялікае балота. Балота было пасярэдзіне, і папрасілі звяры ды птушкі ў Боханькі правесці просты канал ад балота да мора. Каб балота стала меншым ды каб дарога простая была адразу да мора.


ФОТА МАР'ЯНА АНТОНЧЫКА

Нёман у Гродне

Доўга так Боханьку прасілі ці не, мы гэтага не ведаем, але нарэшце вырашыў ён, што трэба такі канал зрабіць. Тады Боханька паставіў свой палец у сярэдзіне таго балота і пацягнуў яго да Балтыйскага мора, разгорваючы такім чынам рэчышча ракі.

Як цягнуў Боханька пальцам — зямля разляталася па два бакі. Пыл і грукат усюды стаяў. Цягне Боханька рэчышча, а ў яго проста на шляху буслянка з малымі буслянятамі стаіць.

Спалохаўся тады бусел за сваё гняздо і сваіх дзетак і кінуўся ляцець да Боханькі. Падляцеў ён да Боханькі ды пачаў клекатаць-верашчаць, што было моцы. І так бусел яму растлумачвае і гэтак. Спрабаваў растлумачыць, што рэчышча ракі акурат ідзе да буслянкі.

З-за незразумелага клекатання спыніўся Боханька і пачаў услухацца. Слухаў, слухаў таго бусла, але што той казаў, так і не зразумеў, бо бусел надта спалохаўся і ад гэтага спяшаўся сказаць многа і шмат усяго патлумачыць…

Адзінае, што зразумеў Боханька, дык гэта тое, што нельга весці рэчышча проста, а трэба абкружыць нейкую перашкоду. І абвёў тады Боханька вакол гнязда пальцам. Ад гэтага, калі глядзець з вышыні на нашую раку, мае яна простае рэчышча, але недзе бліз Гародні робіць вялікае паўкола, а далей цячэ проста.

І вырашыў Боханька назваць гэтую раку і пачаў думаць, як назваць. А паколькі бусел галгытаў нешта незразумелае і не мог адразу Боханька разабраць, што той ад яго хоча, то вырашыў выкарыстаць такую мову, якая будзе незразумела нашым дзядам.

І назваў Боханька нашую раку на чужой, не нашай мове. А па-балцку, на мове, якой мы не разумеем, слова Нёман азначае раку. Так з'явілася рака Нёман яшчэ задоўга да таго, як з'явіліся тут людзі, і так з'явілася яго назва, якую і сёння ніхто не можа растлумачыць. Хоць само слова Нёман азначае — рака.

Ігар КУЗЬМІНІЧ

radzima.org

ДИАЛОГИ О МОДЕРНИЗАЦИИ

АНДРЕЙ КАЗАКЕВИЧ: «Нельзя сказать, что Беларусь идёт своим путём»


Андрей Казакевич

Разговор с директором института «Политическая сфера» доктором политологических наук Андреем Казакевичем «Сниплюс» представляет в рамках «Европейского диалога о модернизации для Беларуси».

11-13 октября 2013 года в Каунасе пройдет Третий Международный конгресс исследователей Беларуси. Туда съедутся около 300 специалистов из разных стран мира, которые занимаются исследованием Беларуси и региона Центральной, Восточной и Северной Европы. Одним из организаторов форума выступает институт «Политическая сфера».

— Есть ли основания говорить об уникальном белорусском пути развития? Или белорусский путь — это миф официальной пропаганды?

— Идея собственного пути развития сформулирована даже не белорусской пропагандой. В конце 1990-х — начале 2000-х годов независимое интеллектуальное сообщество периодически задавалось вопросом: почему Беларусь так сильно отличается от Украины, балтийских стран; тогда очень сильно отличалась от России, которая интегрировалась в мировое сообщество?

Если мы говорим про особый путь, то нужно понимать: это не просто стереотипы или мифы, которые сформулировали белорусские власти; это желание разобраться в том, почему Беларусь отличается от других стран. Иной вопрос, с каким знаком — плюсом и минусом? Здесь консенсуса нет и, наверное, никогда не будет.

Думаю, нельзя сказать, что Беларусь идет своим путем: что она очень сильно отличается от всех остальных, что практикует совершенно иную социальную, экономическую, политическую модель. Естественно, большинство из этих элементов можно найти и в других странах. Хотя набор и отдельные проявления, конечно, для Беларуси уникальны.

Вопрос, однако, не в том, насколько эта модель уникальна или нет — важнее, насколько она адекватна существующему моменту, насколько адекватно может гарантировать и экономическое развитие, и нормальную самореализацию людей, и, в конце концов, некую устойчивость и стабильность. Пропаганда всегда говорила, что мы самые стабильные. Однако если анализировать 20 лет независимости, то Беларусь не является самой стабильной страной ни с экономической, ни с политической точки зрения. Это страна, которая имеет постоянные проблемы, самое будущее которой поставлено под сомнение.

Как тогда можно говорить о какой-то стабильности?

— Раз заговорили об этом, то насколько белорусская система адекватна существующему моменту?

— Нельзя оперировать штампами и схемами, но мне кажется — не адекватна. Ведь она, в частности, показала экономическую неэффективность; сохранить достижения советского времени — этого мало, нужно, чтобы в самой системе были стимулы, внутренний двигатель для развития, совершенствования. Построенная система этому не способствует.

Фактически мы имеем ситуацию, когда значительная часть белорусской экономики живет за счет дотаций, за счет продажи нефтепродуктов, калия. Очевидно, такая система не является ни устойчивой, ни эффективной. Позволить себе роскошь разбрасываться ресурсами, дотировать значительную часть экономики, населения, — это очевидный тупик.

Беларусь до сих пор остается очень изолированной, она не может нормально общаться с западными странами, с Европой (а половина белорусской границы — с Европейским Союзом), что еще раз доказывает ее неэффективность. Будь иначе, смогла бы придумать механизмы, чтобы вписаться в международный контекст и иметь неконфликтные отношения со всеми странами.



Чтобы нормально интегрироваться в мировое сообщество, следует просто соблюдать правила, которых не так и много, держать себя в определенных рамках: стремиться не нарушать прав человека, проводить демократические выборы и так далее. Однако белорусская система так не работает.

— Может ли Беларусь модернизировать свою систему без выполнения стандартного набора «западных реформ»?

— Мне кажется, что нет. По крайней мере, решить проблемы внешнеполитической изоляции и экономической эффективности без использования «западного набора», хотя бы частично, не сможет. Экономическая эффективность требует мобильности социальной, мобильности политической. Часто Беларусь сравнивают с Сингапуром — экономически эффективной, но авторитарной страной. Однако Сингапур очень отличается от нас полной прозрачностью системы, он интегрирован в мировую экономику настолько, что нам и не снилось.

Чтобы повысить экономическую эффективность, необходимо проводить определенные политические изменения, нужно, чтобы местные сообщества участвовали в политической жизни, надо продумать механизмы, которые бы позволили рекрутировать новых людей в политику. Белорусская же модель способствует появлению небольшой олигархии, и на этом все. Она может очень эффективно исключать из политики определенные социальные группы — оппозицию, людей, которые просто ей не нравятся.

Решить проблему внешней изоляции без введения элементарных демократических стандартов невозможно. Ведь в этом отношении США с Европой занимают достаточно принципиальную позицию, и чтобы улучшить с ними отношения, определенную часть стандартов следует принять.

— Есть ли альтернатива?

— Белорусские власти видят таковую в субсидиях со стороны России. Эта альтернатива позволит стабилизировать ситуацию, но никоим образом не решит ни проблему изоляции (напротив, может только усилить, и Беларусь будет превращаться в российский протекторат), ни экономической эффективности. На дотациях никогда не происходят серьезные реформы, исчезают стимулы для самосовершенствования.

— Конфликт «Уралкалия» с «Беларуськалием» показывает, что не все так просто с российской альтернативой...

— Да. За дотации придется отдать определенную часть власти и определенную часть собственности. Если Россия и будет косвенно или напрямую давать деньги белорусскому режиму, то потребует за это определенную и конкретную плату по формуле «часть власти и часть собственности».

— Опыт каких стран при реформировании белорусского модели нам наиболее подходит?

— Ориентироваться на конкретные страны, наверное, нет смысла, ведь каждая идет своим путем, имеет свой исторический опыт, свою политическую систему — скопировать это невозможно. Если мы говорим, например, о Северной Европе — тем более: там страны существуют веками. Даже самая «молодая», Норвегия, более века, имеет свои исторические традиции, там давно сформировалась нация, перед страной давно не стоит вопрос суверенитета, она самостоятельно себя содержит. И очень сильны культурные различия от Беларуси — все-таки это протестантские сообщества.

Скорее, нужно ориентироваться на опыт не стран вообще, но на опыт реформирования отдельных отраслей производства или секторов: высшего образования, сельского хозяйства, местных сообществ, развития медиарынка. Это те сферы, в которых примеры северных стран могут быть интересными для Беларуси.

Но в любом случае к чужому опыту нужно подходить творчески.

Семен КУТКОВЕЦ, «Свободные новости плюс»

АНЕКДОТЫ

Настоящие программисты никогда не работают с 9 до 5. Если какой-нибудь настоящий программист в девять часов утра на работе, это значит, что он провел на работе всю ночь.

***



— Давай встретимся, пообедаем вместе?
— Не могу, у меня сегодня четыре пары...
— Ну сбеги после второй?
— Ага, у людей кольца куплены, рестораны заказаны, а я — сбеги!



***

Подхожу я на дискотеке к девушке и спрашиваю:
– Не хотите потанцевать?
А она мне:
– Сначала у моего бойфренда-боксёра спроси, если не боишься!
Ну, вы же знаете, я человек смелый. Подхожу к нему и спрашиваю:
– Не хотите потанцевать?

АФИША

18.09

Зал — «Ущелье Доннера», США, кроме детей до 18 лет; сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Гостья», США, фантастический триллер; сеансы в 16.00, 18,00 и 20.00

19.09

Зал — «Ущелье Доннера», США, кроме детей до 18 лет; сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Гостья», США, фантастический триллер; сеансы в 16.00, 18,00 и 20.00

20.09

Зал — «Ущелье Доннера», США, кроме детей до 18 лет; сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Гостья», США, фантастический триллер; сеансы в 16.00, 18,00 и 20.00

21.09

Зал — Для детей «Приключения Маши в стране Чудес», Китай, анимация; сеанс в 14.00; «Последний пассажир», США, боевик, триллер; сеанс в 16.00; Дискотека. Начало в 18.00

Видеосалон — «Гостья», США, фантастический триллер; сеансы в 16.00, 18,00 и 20.00

22.09

Зал — Для детей «Приключения Маши в стране Чудес», Китай, анимация; сеанс в 14.00; «Последний пассажир», США, боевик, триллер; сеансы в 16.00, 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Гостья», США, фантастический триллер; сеансы в 16.00, 18,00 и 20.00

24.09

Зал — «Последний пассажир», США, боевик, триллер; сеансы в 18.00 и 20.00

Видеосалон — «Сокровища озера Кабан», Россия, триллер, приключения; сеансы в 16.00, 18,00 и 20.00

РДК

Городской парк — Цирк Никулина

19.09 — начало в 18.00
20.09 — начало в 18.00
21.09 — начало в 13.00 и 17.00
22.09 — начало в 13.00

ИДЁТ ПОДПИСКА НА 4-Й КВАРТАЛ 2013 ГОДА



ВЫЕЗДНАЯ ПОДПИСКА НА 4-Й КВАРТАЛ 2013 ГОДА

20.09.2013 ПЯТНИЦА

9.30 -10.10 ШИЛОВИЧИ
10.30-11.00 ЖИРОВИЧИ
11.20-11.30 ОКУНИНОВО
11.40-12.10 ПАРТИЗАНОВКА
12.30-13.10 НОВОДЕВЯТКОВИЧИ
13.30-14.00 СУРИНКА
14.20-14.50 ГЛОВСЕВИЧИ
15.10-15.30 ДЕРЕВЯНЧИЦЫ

27.09.2013 ПЯТНИЦА

10.00-11.00 ЗЕЛЬВА
11.15-11.45 ДЕРЕЧИН
12.00-12.40 ГОЛЫНКА
13.00-13.40 КОСТРОВИЧИ
13.50.14.20 СЕНЬКОВЩИНА
14.30-15.00 ПОРЕЧЬЕ

ПОДПИШИСЬ ПРЯМО СЕЙЧАС!



И ДЛЯ ЭТОГО ЕСТЬ ПЯТЬ ПРИЧИН

1. «Газета Слонимская» – это газета, которая на рынке СМИ уже 16 лет. Нам можно доверять.
2. Те, кто подпишется на II полугодие 2013 года, примут участие в розыгрыше удивительных сюрпризов.
3. Подписавшись на квартал, Вы получите право на размещение в газете бесплатного частного объявления.
4. Подписная цена на «Газету Слонимскую» приемлема для всех.
5. Подписываясь на «Газету Слонимскую», Вы поддерживаете демократию.

ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА 2–Е ПОЛУГОДИЕ 2013 ГОДА

Наименование печатного издания	На 1 месяц	на квартал	на полугодие
"Газета Слонимская" + "Отдушина"	23 000 руб.	69 000 руб.	138 000 руб.

ВЫРЕЖИ КУПОН, ЗАПОЛНИ ИЗВЕЩЕНИЕ, ПЕРЕЧИСЛИ ДЕНЬГИ НА Р/С И ОТПРАВЬ ПО АДРЕСУ: 231799, Г. СЛОНИМ, УЛ. КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 41, ИЛИ ПОЗВОНИ ПО ТЕЛ. 5-09-31, 8-029-322-06-42 — И НАШ КУРЬЕР ПОДПИШЕТ ВАС НА ДОМУ ИЛИ В ОФИСЕ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

УП "Газета Слонімская"
(получатель платежа)
ЦБУ 422 ф-л 402 ОАО "Беларусбанк" г. Слоним код 689
наименование банка
Счет получателя 3012217000023 Лицевой счёт
УНП 500478342
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Пеня
Всего

Вид платежа	Месяц подписки	Сумма
За подписку		

Кассир
Плательщик

КВИТАНЦИЯ

УП "Газета Слонімская"
(получатель платежа)
ЦБУ 422 ф-л 402 ОАО "Беларусбанк" г. Слоним код 689
наименование банка
Счет получателя 3012217000023 Лицевой счёт
УНП 500478342
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Пеня
Всего

Вид платежа	Месяц подписки	Сумма
За подписку		

Кассир М.П.
Плательщик

УП редакции газеты "Газета Слонимская", УНП500478342, рег. свид. №64, от 05.03.09, Мин. инф. РБ

Сказка

Тысяча лет дружбы

Давайте все мы на секунду представим, что всё вокруг нас живое. И не только живое, но и думает, чувствует.

Каждая травинка, каждый листочек на дереве, каждая букашечка радуется, грустит, плачет и смеётся. Ну как, не верите? Очень зря, ведь это чистая правда, и я в нею верю. Я — это добрый волшебник Калипсо. Вот уже две тысячи лет, как я работаю над своим уникальнейшим творением — «Книгой обо всех живых существах». В ней я записываю все растения, всех животных, насекомых, что когда-либо видел. Я разговариваю с ними, наблюдаю и записываю их истории жизни.

Чушь, говорите вы? Вот недавно, примерно тысячу лет назад, я бывал на чудном острове, где живых существ было видимо-невидимо. Подождите, припомню сейчас, как он назывался. Ах, да! Раньше у этого острова не было названия, но теперь люди называют его Австралия. Стар уже стал, всего не упомнишь... Так вот. Познакомился я в Австралии с очень интересным собеседником. Мы частенько говорили с ним о глобальном потеплении, переселении на земле, о дождливых днях — в общем, обо всём, что нас интересовало. Однажды сидим мы вместе в зарослях дикого тропического леса, попиваем чай из мяты и одуванчика и о чём-то говорим. О чём, я не помню уже, слишком давно это было. Только вот поссорились мы тогда серьёзно. Я был молод и горяч нравом, поэтому не уступал, да и мой друг тоже был из агрессивных хищников, поэтому извиняться не стал. И разошлись мы в разные стороны.

Шестьсот лет я горевал: конечно же, простил его сразу, но был слишком горд и глуп, чтобы первым извиняться. И вот прошло ещё двадцать лет, и я оказался проездом на Земле. Понял свою ошибку. Решил я приехать в Австралию и рассказать моему другу, что был не прав. Однако Земля уже так изменилась, что я с трудом нашёл мой остров. Теперь это был целый континент, населённый людьми, и мало кто из знакомых мне остался на нём. С трудом я отыскал кенгуру, которые поведали мне, что друг мой, которого зовут люди Сумчатый Дьявол, давно не живёт здесь.

Большой кенгуру сказал: «Долго горевал твой друг, не хотел уезжать, всё тебя ждал. Но пришлось ему покинуть Австралию из-за людей. Теперь он живёт на Тасмании и горюет об ушедшей дружбе».

Долго и я после этих слов горевал, и даже, хотите — верьте, хотите — нет, по седой моей бороде пробежала редкая волшебная слеза. Но теперь я знаю, где искать моего друга. Я обязательно поеду, ведь он так долго меня ждёт.

Фаина НАКОНЕЧНАЯ


РИСУНОК ЕВГЕНИЯ ИВАНОВА

Паэтычны куфэрак

Марыя ДМУХОЎСКАЯ

КРЫНІЦА ВЕДАЎ

Кнігі — гэта мудрасць вякоў,
Дзе людзі пісалі не толькі быліны.
Захаваліся кнігі розных часоў,
Сярод іх — і выданне Скарыны.
Ён першы ў нас змог паказаць,
Як можна напісанае надрукаваць,
Кнігу зрабіць і яе захаваць,
Каб праз вякі змаглі людзі чытаць.
З тых часоў і да нашых друкуюцца кнігі.
Яны нас вучылі, бацькоў і дзядоў.
Кніга — крыніца, каб ведаў напіцца,
У кнігах — гісторыя, мудрасць вякоў.
Дрэва ведаў з кнігаў складаецца.
Хто хоча больш ведаць — чытаць той
стараецца.
Інтэрнэт і камп'ютар хочуць кнігу зацьміць,
Ды з кнігаю ім не зраўняцца,
Бо праз кнігі найперш трэба веды набыць,
Каб у тэхніцы той разбірацца.



Дзіцячыя смяшынкі

Калі месца не знаходзіцца...

Ірынка ходзіць па кватэры, не ведаючы, чым заняцца. І прыгаворвае:

— Куды мне запіхнуцца? Ну, куды ж мне запіхнуцца?..

Кот, у якога жыццё не склалася...

Ля крамы сядзіць кот з парваным вухам. Унук бабулі:

— Баба Каця, глядзі, які коцік сціплы.


—А што такое "сціплы"? — пытаецца бабуля.

—Ну, гэта калі на яго глядзіш скрозь слёзы. Быццам у яго жыццё не склалася.

Даслаў Канстанцін КАРНЯЛЮК, Віцебск

Сканворд






Ответы на сканворд: по горизонтали: Амаяк. Чебурашка. Роща. Сто. Атас. Тит. Арк. Ралли. Заяц. по вертикали: Енот. Щи. Сатуратор. Аз. Жаба. Акела. Шут. Ля. Кок. Виц. Асса. Волк

Головоломка

СКОЛЬКО КВАДРАТОВ?



Загадка, с которой справляются лишь 20% людей.

Сколько квадратов вы видите на картинке?

Ответ
16 квадратов 1 х 1, 9 квадратов 2 х 2, 4 квадрата 3 х 3, 1 квадрат 4 х 4, итого: 30 штук.

Старонку падрыхтавала Жанна ПЛЕШКО

РЭДАКЦЫЯ

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Стыль–рэдактар
Жанна ПЛЕШКО

Галоўны бухгалтар
Юлія ЛІБІК
Бухгалтар
Кацярына ГЕРАСІМЧЫК
Аддзел падпіскі і продажу
Ігар ЯРАШ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Уладзімір КАЧАРГА
Алена ДЗЯТЛАВА

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 5-09-31,**
Тэл. 4-79-34, 2-33-95.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Дар'я КРУПНІК
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
8-(044) 715-90-03
(9.00-16.00)
т/факс:
8-(01562)-5-09-27

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Касаўскі рынак,
галоўны корпус, другі паверх, каб. №14
Працуем аўторак — пятніца 9[00]-17[00]
субота — нядзеля 9[00]-15[00]
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

ШКОЛЬНІКІ ЗНАЁМІЛІСЯ З ГОРАДАМ ПРАЗ СТАРЫЯ НАЗВЫ ВУЛІЦ



Выдавалі маршрутныя лісты


Адзначаліся ў пікетоўца

У Слоніме прайшло раённае турыстычнае краязнаўчае арыентаванне сярод старшакласнікаў, прысвечанае 70-годдзю з дня вызвалення Слонімшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

«Разлічана гэта мерапрыемства на тое, каб мы былі годныя тых, хто загінуў і здзейсніў геройскі подзвіг на нашай Слонімшчыне. Каб мы не толькі памяталі тых людзей, хто абараняў Радзіму, а і дзякавалі ім за іх подзвіг. Мы можам ім аддзячыць сваёй любоўю і ведамі пра Радзіму, а ў першую чаргу — пра свой горад", — распавяла метадыст народнага музея імя А. Жукоўскага Аліна Процак.

У параўнанні з мінулымі падобнымі мерапрыемствамі, на гэты раз арганізатары вырашылі крыху ўскладніць заданні для школьнікаў. Адзінаццаці камандам неабходна было знайсці вуліцы і пікетоўцаў у пэўнай паслядоўнасці.


Знаёміліся з заданнем

Складанасць заключалася ў тым, што ў заданні былі пазначаны не сучасныя назвы вуліц, а старыя — некаторыя з вуліц Слоніма ў розныя перыяды часу мелі розныя назвы.

Стартавала мерапрыемства ў мінулую суботу каля краязнаўчага музея імя І. Стаброўскага. Пасля на працягу дзвюх гадзін вучні шукалі вуліцы Слоніма. У ходзе конкурсу паводле апісання ў маршрутным лісце ім трэба было знайсці дзесяць вуліц, якія знаходзяцца ў цэнтры горада.

У завяршэнне краязнаўчага мерапрыемства вызначыліся чатыры лідары. Першай паспяхова да фінішу прыйшла каманда СШ №10, якая і атрымала кубак народнага музея імя А. Жукоўскага. Другімі сталі вучні ліцэя. СШ №4 на апошнім пікеце адзначылася на адну хвіліну раней, чым вучні з СШ № 2.

Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Фота аўтара


Пабеглі шукаць вуліцы

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 18 сентября	14°	16°	13°
ЧЕТВЕРГ, 19 сентября	10°	13°	12°
ПЯТНИЦА, 20 сентября	9°	18°	14°
СУББОТА, 21 сентября	10°	15°	16°
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 22 сентября	10°	19°	15°
ПОНЕДЕЛЬНИК, 23 сентября	19°	23°	14°
ВТОРНИК, 24 сентября	18°	23°	13°
СРЕДА, 25 сентября	14°	17°	12°

http://www.meteoprog.by

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук

ЗАСНАВАЛЬНІК **Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК**
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года. выдадзена Міністэрствам інфармацыі РБ. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Адрас рэдакцыі: г.Слонім, вул. Касаўскі тракт, д. 37, офіс 16
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (ільготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 17 верасня 2013 года **16:00**.
Аб'ём – восем умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 5051